Абрыдла нам панаванне чужынцаў – і камуністаў, і паноў. Трэба нам паўстаць і збудаваць вольную незалежную Беларусь”, – звярталіся маладыя патрыёты да насельніцтва. Адна з лістовак, якія распаўсюджваліся сярод жыхароў Слуцка і ваколіцаў, змяшчала наступны верш, падпісаны псеўданімам Малы Язэп:

Паўстань!
Ня сьпі, мой любы селянін!
Паўстань супроць чужой улады!
Паўстаньне – сродак твой адзін,
Ты роднай Бацькаўшчыны сын,
Сваіх ня згубіш пуцявін,
Дык не шукай чужых спагады!
За зброю! Бі! Хай гінуць гады!
Паўстань! Ня бойся і ня трусь!
Ратуйма нашу Беларусь!

Такім чынам, беларускамоўныя адозвы маюць ярка выражаны нацыянальны і патрыятычны змест. Іх аўтары былі перакананымі змагарамі за вольную Бацькаўшчыну–Беларусь. Выяўленыя новыя дакументы з’яўляюцца важнай крыніцай па гісторыі нацыянальнага антысавецкага руху ў Беларусі ў міжваенны перыяд.


1. Беларускія пісьменнікі: Бібліягр. слоўн. У 6 т. Т. 2 / Пад рэд. А.В. Мальдзіса; Рэкал.: І.Э. Багдановіч і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – 541 с.
2. Віцьбіч, Ю. Антыбальшавіцкія паўстанні і партызанская барацьба на Беларусі / Ю.Віцьбіч. – Нью–Ёрк: БІНІМ, 1996. – 398 с.
3. Гігін, В.Ф. Разгром небальшавіцкіх палітычных партый і груп на тэрыторыі Савецкай Беларусі ў першай палове 1920-х гг. / В.Ф.Гігін // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 10. – С. 6.
4. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А.Вабішэвіч [і інш.]; рэдкал. М.Касцюк (гал.рэдактар) і інш. – Мінск: Экаперспектыва, 2006. – 613 с.
5. Грыцкевіч, А.П. Слуцкае паўстанне 1920 г. / А.П.Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6 / Беларус.Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – С. 347–348.
6. Ермаловіч, В. Лістоўка / В. Ермаловіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4 / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1997. – С. 374.
7. Інфармацыйнае паведамленне Бабруйскага АК КП(Б)Б ад 08.02.1930 г. // ДАГАМаг. – Фонд 6575. – Воп. 1. – Спр. 770. – Арк. 95–96.
8. Кузьміч, В.М. Нелегальная дзейнасць на беларускім участку савецка-польскага памежжа (1921–1939 гг.) / В.М.Кузьміч // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2008. – № 1. – С. 53–61.
9. Латышонак, А. Жаўнеры БНР / А.Латышонак. – Беласток: БГТ, 2009. – 366 с.
10. Пушкін, І.А. Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20–30-я гады ХХ ст.): дакументы і матэрыялы / І.Пушкін. – Мінск: Медысонт, 2009. – 192 с.
11. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах / Ул.Ляхоўскі, Ул.Міхнік, А.Гесь. – Мінск: “Энцыклапедыкс”, 2001. – 274 с.
12. Стужынская, Н.І. Беларусь мяцежная: з гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву: 20-я гг. ХХ ст. / Н.І.Стужынская. – Вільня: Беларуская жаночая ліга, 2000. – 255 с.



**Дулаў А.М.**


## ЛІСТЫ Г.С. ЕЎДАКІМЕНКІ ЯК КРЫНІЦА ПРА ДЗЕЙНАСЦЬ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ВІЦЕБСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДІНСТЫТУТА НА МЯЖЫ 1930–1940-х гг.

Навуковае вывучэнне перыяду 1930-х гг. у дзейнасці гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава толькі пачынаецца. Асноўнымі крыніцамі звестак з’яўляюцца матэрыялы афіцыйнага справаводства факультэта, якія захоўваюцца ў складзе фонда педагагічнага інстытута ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці [1]. Аднак патэнцыял гэтых крыніц ў даследаванні шэрага аспектаў, у прыватнасці, вучэбнага працэсу праз прызму ўспрыняцця тагачасных студэнтаў, студэнцкага паўсядзённага жыцця, даволі абмежаваны. На жаль, да нядаўняга часу нам былі невядомыя і крыніцы

асабістага паходжання, якія б утрымлівалі інфармацыю па акрэсленых праблемах. У пэўнай ступені выправіць сітуацыю ўдалося выпадкова.

Напрыканцы лютага 2011 г. газета “Аргументы и факты в Белоруссии” змясціла фотаздымак студэнтаў гістфака ВДПІ імя С.М. Кірава набору 1938 г., зроблены пасля заканчэння імі другога курса, і невялічкі допіс аднаго з тых студэнтаў – Георгія Савіча Еўдакіменкі з Гомеля, які спадзяваўся даведацца пра лёс аднакурснікаў [2]. Намеснік дэкана гістарычнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава Дз.В. Юрчак звязаўся з рэдакцыяй, высветліў адрас Георгія Савіча і напісаў яму ліст з шэрагам пытанняў. Разгорнуты адказ кандыдат гістарычных навук, дацэнт, інвалід другой групы Вялікай Айчыннай вайны, падпалкоўнік у адстаўцы Г.С. Еўдакіменка даслаў аператыўна. Завязалася ліставанне. Такім чынам мы атрымалі новую крыніцу асабістага паходжання пра дзейнасць гістфака ВДПІ імя С.М. Кірава на мяжы 1930 – 1940-х гг. і лёсе аднаго са студэнтаў. Мэта працы: вызначыць каштоўнасць лістоў Георгія Савіча Еўдакіменкі як крыніцы пра дзейнасць гістарычнага факультэта ў перадваенныя гады.

Найбольш інфарматыўнымі ў кантэксце праблемы, якая нас цікавіць, з’яўляюцца першыя два лісты, якія ўтрымліваюць успаміны Г.С. Еўдакіменкі [3; 4]. Пры аналізе іх зместу неабходна ўлічваць, што ўспаміны аўтара з’яўляюцца разгорнутым адказам на пастаўленыя пытанні (перад намі своеасаблівае завочнае вольнае інтэрв’ю). Прысутнічае ў лістах і даследчыцкі элемент: аўтар імкнецца дайсці да ісціны ў пытаннях, якім па ліку ў 1930-я гг. быў іх набор, які быў лёс ВДПІ падчас Вялікай Айчыннай вайны? Крэда гісторыка – вернасць гістарычнай праўдзе. У “лірычным адступленні” (тэрмін самога Георгія Савіча) у другім лісце, аўтар палемізуе з акадэмікам М.М. Пакроўскім, які казаў, што гісторыя ёсць «политика, опрокинутая в прошлое». Г.С. Еўдакіменка піша: «Мы то с Вами знаем, что это не так. Это просто есть люди, которые опрокидывают историю под существующую политику…» [4, арк. 10]. Лісты напісаны даволі добрай літаратурнай моваю.

Аўтар лістоў паведаміў звесткі з уласнай біяграфіі. Георгій Савіч нарадзіўся ў 1920 г. ў сям’і вясковых настаўнікаў, што паходзілі з сялян [4, арк. 6 – 7]. Станавіцца гісторыкам ён не збіраўся. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў мястэчку Шумячы на Смаленшчыне ён падаў дакументы на фізіка-матэматычны факультэт Смаленскага педінстытута імя К. Маркса, аднак не прайшоў па конкурсе (конкурс склаў 7 чалавек на месца). “Вярбоўшчыкі” з трох іншых ВНУ запрасілі хлопца падаваць дакументы на фізмат. Свой выбар Георгій Савіч спыніў на Віцебскім дзяржаўным педінстытуце імя С.М. Кірава, дзе па словах “агітатара” Камінскага на фізіка-матэматычны факультэт быў недабор. У Віцебску ж Г.С. Еўдакіменку чакала вялікае расчараванне: дырэктар інстытута Каляда паведаміў, што фізмат цалкам укамплектаваны, недабор толькі на гістарычны факультэт, “и стал убеждать меня поступить именно на исторический факультет, подкрепив это предложение высказыванием И.В. Сталина о том, что «историки нам нужны на вес золота»” [3, арк. 1; 4 арк. 1]. Георгій Савіч мусіў пагадзіцца. Так, даздаўшы іспыты па гісторыі і геаграфіі, ён стаў студэнтам гістфака.

Вялікая Айчынная вайна заспела студэнтаў педінстытута за здачай летняй сесіі. На другі дзень вайны Г.С. Еўдакіменка разам з таварышамі з’явіўся ў ваенкамат, аднак у армію хлопцаў з прыпіснымі пасведчаннямі не ўзялі, бо ажыццяўляўся прызыў тых, хто прайшоў службу ў войску. У той час гаркам камсамола мабілізаваў камсамольцаў на барацьбу з дыверсантамі, якія ракетамі паказвалі нямецкім самалётам аб’екты для бамбёжкі. У ліку іншых Георгію Савічу давялося патруляваць вуліцы Віцебска [5].

5 чэрвеня 1941 г., па ўспамінах аўтара лістоў, па радыё было аб’яўлена, што з горада адыходзіць на ўсход апошні эшэлон і тыя, хто жадае эвакуіравацца, павінны прыбыць на вакзал. Эшэлон са 150 вагонаў вывозіў з горада ў Куйбышаў (сёння – Самара) абсталяванне і рабочых панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя К. Цэткін [3, арк. 5]. Гэтым эшэлонам пакінулі горад і Г.С. Еўдакіменка разам з двума таварышамі. Як паве-

даміў Георгій Савіч, “кто-то нам сказал, что туда же (у Куйбышаў – *А.Д.*) отправлено и имущество нашего пединститута”. Але звесткі не пацвердзіліся. Марнымі аказаліся і пошукі інстытута ў Саратаве і Энгельсе [3, арк. 6; 4, арк. 2].

Хлопцы накіраваліся ў г. Мелекес (Дзімітраўград), дзе жылі сваякі аднаго з іх. У канцы лістапада 1941 г. яны прыехалі ў горад, дзе Георгій Савіч уладкаваўся падсобным рабочым на будаўніцтва цэхаў эвакуяванай фабрыкі імя К. Цэткін. 11 снежня яго выклікалі ў ваенкамат і накіравалі вучыцца на Ленінградскія курсы ўдасканалення палітсаставу запасу Чырвонай Арміі, што былі эвакуяваны ў Мелекес. Пасля двух месяцаў вучобы, у лютым 1942 г., Г.С. Еўдакіменка – зампалітрука роты 170-га палка ў складзе 50-й арміі – прыбыў на Цэнтральны фронт. У ліпені 1942 г. Георгій Савіч быў цяжка паранены ў баях пад Зайцавай гарой на Смаленшчыне. Пасля выпіскі са шпіталю прызнаны абмежавана годным к нестраявой і накіраваны ў 85 аэрадромна-тэхнічную роту 102 батальёна аэрадромнага абслугоўвання ў складзе якой прайшоў вайну на Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім і 3-м Беларускім франтах. Заканчэнне вайны сустрэў пад Кёнігсбергам (Калінінград) [3, арк. 6 – 7; 4, арк. 7 – 8].

Пасля дэмабілізацыі ў жніўні 1945 г. Г.С. Еўдакіменка спрабаваў аднавіцца на гістфак ВДПІ імя С.М. Кірава, аднак набор быў толькі на першы курс. Каб не губляць час, пасля года працы ў Мсціславе (там жылі бацькі) Георгій Савіч аднавіўся на гістарычны факультэт Яраслаўскага педінстытута імя К.Д. Ушынскага. Летам 1947 г., пасля заканчэння інстытута, разам з маладою жонкай Г.С. Еўдакіменка вярнуўся ў Мсціслаў, прыступіў да працы, а ў снежні паступіў па дадатковым наборы ў аспірантуру пры кафедры гісторыі СССР Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага.

Пасля аспірантуры быў накіраваны на працу ў Гомельскі педінстытут імя В.П. Чкалава старшым выкладчыкам кафедры гісторыі СССР. У лістападзе 1951 г. у БДУ імя У.І. Леніна Георгій Савіч абараніў кандыдацкую дысертацыю “Сацыялістычная індустрыялізацыя ў БССР за гады трох Сталінскіх пяцігодак (1928–1941)”. Пачаў працаваць над доктарскай, але падвяло здароўе (гісторык прыслухаўся да думкі ўрача: “лучше быть живым доцентом, чем мертвым профессором”) [4, арк. 9]. У Гомельскім педінстытуце (пазней – дзяржуніверсітэце імя Ф. Скарыны) Г.С. Еўдакіменка адпрацаваў больш за 40 гадоў, займаў пасады дацэнта, намесніка дырэктара інстытута па вучэбнай і навуковай рабоце, дэкана філалагічнага факультэта, загадчыка кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі, гісторыі СССР і БССР. У чэрвені 1991 г. Георгій Савіч, які ўжо некалькі гадоў працаваў, знаходзячыся на пенсіі, пакінуў універсітэт. Спіс апублікаваных прац і паслужны спіс Г.С. Еўдакіменка прывёў у другім лісце [3, арк. 7–8; 4, арк. 8–14].

У лістах Г.С. Еўдакіменка паведаміў інфармацыю пра студэнцкі побыт, вучэбны працэс, распавёў пра выкладчыкаў, стварыў каларытныя партрэты некаторых з іх. Яскравае ўражанне ў першакурсніка Г.С. Еўдакіменкі пакінулі жыллёвыя ўмовы першага семестра навучання. Паколькі інстытут не паспеў завяршыць будаўніцтва інтэрната для студэнтаў, больш чым сотню першакурснікаў размясцілі ў актавай зале інстытуцкага клуба (былой царкве). “Коечки стояли впритык друг к другу. Теснотища и духотища. А ночью – дышать было нечем” [3, арк. 1–2]. Новы інтэрнат па праспекце Фрунзэ быў здадзены ў канцы снежня. Там умовы былі значна лепшыя – па чатыры чалавекі ў пакоі. Як успамінае Георгій Савіч, з хлопцаў свайго пакою толькі ён не атрымліваў стыпендыю, хаця вучыўся на “чатыры” і “пяць”. Справа ў тым, што па сацыяльным паходжанні ён лічыўся прадстаўніком інтэлігенцыі (бацькі – настаўнікі), якім па тагачасным палажэнні выплата стыпендыі не прадугледжвалася [3, арк. 2].

Найбольшай цяжкасцю ў вучобе Г.С. Еўдакіменка называе адсутнасць стабільных падручнікаў (напрыклад, першы падручнік па гісторыі СССР для ВНУ з’явіўся толькі ў 1939 г. – *А.Д.*). Гэта патрабавала ўважлівасці на лекцыях. “На лекциях приходилось ловить каждое слово преподавателя. Конспектировать услышанное как можно полнее. Мой метод в этом отношении был довольно простым. Тетрадный лист делился



Рэпазіторый ВДУ

на две части. На одной части я записывал то, что успевал. Затем, придя после занятий в общежитие, я внимательно перечитывал записанное. По ходу чтения вспоминал услышанное на лекции и записывал на второй половине листа. Затем шел поиск дополнительной литературы (в основном в библиотеке им. М. Горького)" [3, арк. 2–3].

Вольнага часу амаль не было. Шмат увагі камсамольская арганізацыя інстытута надавала падрыхтоўцы студэнтаў да абароны: кожны павінен быў здаць экзамен на атрыманне абарончых значкоў (ГТО, ГСО, ПВХО, "Варашылаўскі стралок"). Рэгулярна праводзіліся ваенізаваныя паходы (пешыя або лыжныя).У сувязі з гэтымі падзеямі аўтар згадвае трагічны лёс студэнткі, якая падчас сесіі не прыняла ўдзелу ў паходзе, бо рыхтавалася да экзамену, а стыпендыя з'яўлялася для яе адзінай крыніцай існавання. Дзяўчыну выклікалі ў камітэт камсамолу, дзе загадалі пакласці на стол камсамольскі білет. "Мотив: «а если завтра война, она убежит в кусты»" [3, арк. 3]. Расчуленая дзяўчына на вуліцы кінулася пад трамвай, ёй адрэзала кісці рук. Аднак ўрачы здолелі яе выратаваць, зрабілі пратэзы, з дапамогай якіх студэнтка магла пісаць. Яна працягнула вучобу. "Но когда город заняли немцы, ее выдал как идейно преданную Ленину–Сталину бывший председатель студенческого профкома института. Ее немцы расстреляли" [3, арк. 3].

Георгій Савіч адзначыў адну з асаблівасцяў выкладчыцкага калектыву: паколькі гістарычны факультэт быў створаны нядаўна, многія выкладчыкі былі прыезджыя. Нягледзячы на дзесяцігоддзі, што прайшлі з часу навучання, прафесійная памяць Георгія Савіча Еўдакіменкі захавала прозвішчы выкладчыкаў, што працавалі на гістфаку. Аўтар вельмі сціпла зазначыў: "я помню только некоторых из них и то только фамилии (тогда все были товарищи: товарищ Умрейко и т.д.)", аднак у пераліку ў сваім першым лісце прывёў звыш 20 прозвішчаў з указаннем дысцыплін, якія выкладаліся гэтымі людзьмі на першым – трэцім курсе гістфака ў перадваенныя гады [3, арк. 4]. Пра траіх – М.Б. Фрыдман (выкладала гісторыю СССР перыяду капіталізму), М.Ф. Лазбеня (выкладаў педагогіку і гісторыю педагогікі), а таксама М.Х. Ханіна (выкладаў рускую мову) Георгій Савіч прывёў некаторыя дадатковыя звесткі [3, арк. 4–5]. У другім лісце аўтар прывёў звесткі таксама пра М.В. Кочатва (чытаў гісторыю СССР ад старажытнасці да капіталізму, з першага па трэці курсы), выкладчыка дыямату і гістмату Аздуні, выкладчыцу школьнай гігіены Дэларю [4, арк. 3 – 4].

Выклікае цікавасць інфармацыя пра лёс дацэнта М.Ф. Лазбеня, які да ВДПІ працаваў у Гомелі на рабфаку і ў аддзеле народнай адукацыі. "По чьему-то доносу ему приписали участие в Стрекопытовском мятеже, исключили из партии и запретили жить на территории БССР (відавочна, доказаў віны не было – *А.Д.*). Он поселился где-то в России. Приезжал в Витебск, читал 2 – 3 лекции и в тот же день покидал пределы Белоруссии. После войны его в какой-то степени реабилитировали, но в партии не восстановили" [3, арк. 4 – 5]. М.Ф. Лазбень, які разам з Георгіем Савічам працаваў у Гомельскім педінстытуце, узначальваў кафедру педагогікі, дамагаўся аднаўлення ў партыі, дайшоў да XX з'езда КПСС. Аднак яму адмовілі ў аднаўленні стажу, прапанавалі ўступаць наноў, ад чаго педагог прынцыпова адмовіўся і да канца жыцця застаўся беспартыйным [3, арк. 5].

У сваіх лістах Георгій Савіч прывёў звесткі пра тое, што ў шостым семестры яго навучання (г.зн. у 1941 г.) на гістфак ВДПІ імя С.М. Кірава для чытання спецкурсаў прыязджалі буйныя гісторыкі, прафесар С.У. Бахрушын і акадэмік Я.В. Тарле. "Бахрушин Сергей Владимирович что-то рассказывал о Сибири (адна са сфер навуковых інтарэсаў гісторыка – *А.Д.*). Читал лекции свободно, без всяких конспектов. Приходил. Становился за трибуну, здоровался, затем устремлял свой взор в верхнюю часть ближайшего окна и очень живо излагал материал. Иногда только на аудиторию бросал беглый взгляд. Слушать его было очень легко. И конспектировать тоже" [4, арк. 3]. Лекцыі акадэміка Я.В. Тарле, па ўспамінах Г.С. Еўдакіменкі, былі не такімі яскравымі, аднак "все было понятно, конспектировать тоже успевали. Рассказывал он нам о военных действиях против армии Наполеона на территории Белоруссии. И нас он сразу успокоил, заявив, что в библиотеке есть изданные им



Репозиторий ВГУ

книги о Наполеоне и об Отечественной войне 1812 года” [4, арк. 3].

Г.С. Еўдакіменка паведаміў пра выкладанне гісторыі Беларусі: “В общей системе предметов курс истории Белоруссии занимал свое особое место. Во-первых, потому что он только что был включен в наш учебный план. А, во-вторых, это был единственный предмет, который читался на чистом белорусском языке и назывался он «Гісторыя Беларусі». Читал его нам преподаватель Лютаровіч (так у тэксце – *А.Д.*). Поскольку все остальные предметы нам читались на русском языке, то мы по привычке конспектировали и его лекции на русском языке. Но попытка сдать экзамен по этому предмету тоже на русском языке первой пятерке экзаменующихся (обычно первыми на экзамен шли отличники) обернулась оценкой “пасрэдна”. Остальные «вошли в колею» и получили достойные оценки в соответствии с показанными знаниями” [4, арк. 4 – 5].

Звяртаюць на сябе ўвагу і звесткі пра бацьку і сына Брандтаў, выселеных з Ленінграда інтэлігентаў, заўважных у перадваенным культурным і грамадскім жыцці Віцебска, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны пайшлі на супрацоўніцтва з нацыстамі і панеслі заслужанае пакаранне: былі ліквідаваны падпольшчыкамі [6, с. 57 – 60; 7]. Характарыстыка паводзін Брандтаў напярэдадні вайны і ў час яе дала магчымасць Г.С. Еўдакіменку зрабіць выснову: “Оба Брандта – типичный образчик двурушничества, предательства” [4, арк. 5–6].

Такім чынам, лісты Г.С. Еўдакіменкі ўтрымліваюць успаміны, якія з’яўляюцца каштоўнай крыніцай пра стан гістарычнай адукацыі ў ВДПІ імя С.М. Кірава ў перадваенны перыяд. Інфармацыя, выкладзеная ў лістах дазваляе паглядзець па жыццядзейнасць гістфака вачыма тагачаснага студэнта, адчуць дух эпохі, прасачыць франтавы шлях і пасляваенны лёс чалавека, сэнсам жыцця якога, дзякуючы віцебскім выкладчыкам, стала “рамяство гісторыка”.

Апошняе падкрэслівае каштоўнасць прыведзенай у лістах інфармацыі. Г.С. Еўдакіменка падае свае ўспаміны лагічна, канкрэтна, з высокай ступенню дакладнасці (прыводзячы звесткі з уласнай біяграфіі ён абапіраецца не толькі на памяць, але і на дакументы). Праўда, прысутнічаюць у лістах і памылкі памяці, верагодна, у асобных эпізодах ёсць наслаенні інфармацыі, атрыманай пазней з літаратуры, некаторыя факты патрабуюць дадатковай праверкі. Аднак, безумоўна, звесткі лістоў будуць карыснымі пры падрыхтоўцы абагульняльнай працы пра мінуўшчыну гістарычнай адукацыі на Віцебшчыне.

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 204. Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М. Кірава.
2. Евдокименко Г.С. Первые историки Витебского пединститута // Аргументы и факты в Белоруссии. – 2011. – 23 лют. – С. 16.
3. Ліст Г.С. Еўдакіменкі Дз.В. Юрчаку ад 15.03.2011 // Асабісты архіў Дз.В. Юрчака.
4. Ліст Г.С. Еўдакіменкі Дз.В. Юрчаку ад 05.04.2011 // Асабісты архіў Дз.В. Юрчака.
5. Еўдакіменка Г. Пятая калона не прайшла // Гомельскі універсітэт. – 1991. – 12 чэрв. – С. 2.
6. Подлипский А.М. Первая не только по номеру: История Витебской СШ № 1. Ч. 1: 1918 – 1968. – Витебск, 1998. – 167 с.
7. Подлипский А.М. История одного предательства // Витебский проспект. – 2011. – 21 чэрв. – С. 6.

**Мусагалиева А.С.**

## ИСТОЧНИКИ ИСТОРИИ ПОЛИТИЧЕСКИХ РЕПРЕССИЙ В КАЗАХСТАНЕ

На сегодняшний день вопрос о политических репрессиях в Советском Союзе исследуется историками всего мира. Сейчас назрела необходимость в более глубоком раскрытии страниц истории тоталитарного государства. Для этого, прежде всего, необходимо всесторонне изучить исторические источники, связанные с политическими репрессиями. Уже имеются многочисленные исторические труды, но более глубокое исследование источников по этой теме даст возможность раскрыть ее еще глубже.

Для СССР, в том числе и Казахстана, XX век был трудным. Пришедшие к власти новое советское правительство в корне изменило не только общество, но и трагически повлияло на судьбы народов. Это волна политических репрессий в годы тоталитарного государства.



Репозиторий ВГУ